№ 1 (146)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Студзень 2013 г.

2013 ГОД АБЯЦАЕ БЫЦЬ ВЯСЁЛЫМ

Вось нарэшце і пачаўся доўгачаканы новы 2013 год, з якім мы ўсе звязваем пэўныя спадзяванні на лепшае жыццё для сваіх сем'яў і ўсёй нашай роднай Беларусі.

Што казаць, здаецца, нашы спадзяванні на лепшае жыццё пачалі з пачатку года ажыццяўляць і нашы родныя беларускія чыноўнікі на чале са сваім нязменным кіраўніком. Па ўсіх каналах дзяржаўнага радыё і тэлебачання, на старонках "чэсных" газет было аб'яўлена пра падвышэнне мінімальнага заробку ў краіне да памеру 1 395 000 рублёў і тарыфнай стаўкі першага разраду да 240 000 рублёў. Зараз кожны шчаслівы працаўнік нашай квітнеючай Беларусі будзе атрымліваць за гадзіну сваёй працы заробак у памеры не менш 8340 рублёў. Захацелась плакаць ад такога клопату нашых самых клапатлівых і шматлікіх (у параўнанні з іншымі краінамі) чыноўнікаў аб простых людзям. Са слязамі шчасця на вачах пачаў думаць пра тыя цудоўцыя перспектывы, якія разгорнуцца перад намі, простымі людзьмі, у пачаўшымся 2013 годзе, аднак пасля паглядзеў на іншыя "навагоднія падарункі" ад родных "слуг народа" і слёзы радасці нейкім чынам самі высахлі.

Адразу прачытаў пра тое, што з 1 студзеня падвышаны на тарыфы жыллёва-камунальныя паслугі – на цеплавую энергію яны ўзраслі на 5 %, на электрычную – на 9,5 %.

Пасля даведаўся, што доступ у інтэрнэт і мабільная сувязь падаражэлі на 20 %, бо цяпер да кошту паслуг сувязі для фізічных асоб дададзены 20-працэнтны ПДВ. Вырастуць тарыфы і на прыродны газ. А пачатак цыгарэт падаражае прыкладна на 2 тысячы. Бліжэйшым часам падвысяцца кошты на бензін і гарэлку, бо

(Пачатак. Заканч. на стар. 2)



ПЕНСИОННЫЙ ВОЗРАСТ ПОКА НЕ ПОВЫСЯТ



Вопрос о повышении возраста выхода на пенсию в Беларуси снят. Об этом на совместном заседании Палаты представителей и Совета Республики Национального собрания заявил заместитель премьер-министра Беларуси Анатолий ТОЗИК, информирует БЕЛТА. В 2012 году в Беларуси обеспечивался поэтапный рост пенсий, констатировал Анатолий Тозик. Определенным новшеством стало введение повышенных размеров так называемых пенсионных бонусов за добровольную отсрочку обращений за пенсией.

Если человек достигает пенсионного возраста и хочет еще один год поработать, не получая пенсии, то его расчетная пенсия увеличивается на 6%, за второй год — плюс 8%, за третий — плюс 10%, за четвертый — 12%, за пятый и последующие годы отсрочки — плюс 14%, напомнил вице-премьер.

Вице-премьер проинформировал также, что с 1 января 2012 года в Беларуси установлена ежемесячная целевая доплата к пенсии пожилым гражданам, достигшим 75-80 лет.

Шкловский пиротехник

27 декабря в 22-30 вблизи магазина «Сузорье» в Шклове ИДН, ЭКО задержан местный житель 1997 г.р., у которого обнаружено и изъято 162 единицы пиротехнических изделий.

2013 ГОД АБЯЦАЕ БЫЦЬ ВЯСЁЛЫМ

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

значна ўзраслі акцызы на гэтыя тавары. Думаю, паважаным чытачам не трэба тлумачыць, што, калі даражэе паліва для аўтамабільнага транспарта, амаль аўтаматычна ўзрастаюць кошты на ўсе тавары, таму што іх жа патрэбна перавозіць да спажыўцоў.

Ну а чыгунка ўжо таксама падаражэла – з 4 студзеня кошты на білеты для праезда чыгуначным транспартам унутры краіны павялічыліся на 17 %, на міжнародных накірунках яны павысіліся яшчэ напярэдадні Новага года.

Дарэчы, падвышаюцца падаткі для шэрагу прадпрымальнікаў, якія гандлююць прадуктамі харчавання. Зразумела, што прадпрымальнікі сабе ў страту працаваць не будуць, таму гэтае падвышэнне падаткаў у рэшце-рэшт аплоцім са сваёй кішэні, за кошт падвышэння цэн на гэтыя самыя прадукты харчавання, мы з вамі, шаноўныя чытачы.

Карацей, калі вы крыху задумаецеся, паважаныя чытачы, то адразу зразумееце, што абяцаны рост заробкаў аж на цэлых 6,7 % працэнтаў з Новага года (ва ўсялякім выпадку, так сцвярджаюць чыноўнікі з беларускага ўрада) проста ператвараецца ў фікцыю, бо ўсё гэтае нязначнае падвышэнне з’ядаеца ростам коштаў літаральна на ўсё. Прычым кошты падвышаюцца ўжо зараз, а павышаныя заробкі народ атрымае, у лепшым выпадку, у другой палове лютага 2013 года.

Да таго ж заробкі гэтыя вырастуць, хутчэй за ўсё, толькі ў бюджэтнікаў, клопат пра якіх пастаянна дэкларуюць нашы мудрыя чыноўнікі, бо самі ж да гэтых “бюджэтнікаў” і адносяцца. У працаўнікоў вытворчасці, за кошт якіх, у прынцыпе, атрымліваюць свае зарплаты усе супрацоўнікі бюджэтных устаноў, добра, каб заробкі не знізіліся, як гэта адбываецца апошнім часам пастаянна ў нашым Бялыніцкім раёне. Ужо зараз у шмат у якіх арганізацыях раёна сталі скарачаць працягласць рабочага дня для працоўных, каб такім чынам зменшыць і без таго невялікія заробкі.

Чэсна кажучы, заўсёды здзіўляюсь, як нашы доблесныя статыстыкі вылічваюць сярэднія заробкі па Бялыніцкаму раёну. Згодна іх дадзеных, сярэдні налічаны заробак па народнай гаспадарцы Бялыніцкага раёна ў кастрычніку склаў 3 587,4 тысяч беларускіх рублёў. Пры гэтым, згодна дадзеных ужо абласных статыстыкаў, у кастрычніку сярэдні налічаны заробак у гарадскім пасёлку Бялынічы склаў 3 442 111 рублёў. Карацей, атрымліваецца, што ў Бялынічах працаўнікі атрымліваюць нашмат меней, чым у раёне цалкам, так што хутка самі статыстыкі перабяруцца ў вёску працаваць, калі верыць іх лічбам. Аднак штосьці наплыву жадаючых пакуль не назіраецца… Дарэчы, як і працаўнікоў вёсак Бялыніцкага раёна, якія б верылі ў тое, што яны атрымліваюць заробкі, большыя, чым у працаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый гарадскога пасёлка Бялынічы. Парадокс, аднака…

Яшчэ больш цікава, што, згодна дадзеных абласных статыстыкаў, сярэднемесячны заробак у Бялынічах у лістападзе аказаўся нашмат меншым, чым у кастрычніку – 3 356 151 рублёў. Дзіўна неяк – распавядаем пра шалёны рост, а заробкі ў Бялынічах падаюць нават згодна нашай самай аб’ектыўнай у свеце статыстыцы. Аднак не сумняваюсь, што ў дадзеных за снежань патрэбная лічба сярэдніх заробкаў будзе намаляваная без усялякіх пытанняў, мы ж ведаем, што “статыстыка можа ўсё”. Аднак ці палепшыцца ад гэтага наша жыццё – вялікае пытанне…

Якраз напярэдадні Новага года давялось паўдзельнічаць у сустрэчы з вядомым беларускім эканамістам Аляксандрам Чубрыкам, які распавёў пра верагодныя сцэнары развіцця падзей у эканоміцы Беларусі ў бліжэйшыя гады. Калі сказаць сцісла, перспектывы гэтыя не вельмі вясёлкавыя, нават пры рэалізацыі самага лепшага сцэнара. Справа ў тым, што ўсе апошнія гады мы жылі фактычна ў пазыку, нахапалі процьму крэдытаў, а зараз прыйшоў час іх аддаваць. Таму патрэбна зацягваць паясы, каб іх выплаціць. Ну, але ж нашым чыноўнікам усе гэтыя крэдыты пофіг, працягваем браць новыя, Аляксандр Рыгоравіч сказаў, што Расія два мільярды долараў дасць, мільярд Кітай, яшчэ дзевяць мільярдаў на АЭС у расіян возьмем. Толькі чым разлічвацца будзем, нашы чыноўнікі і той, “хто крыху вышэй за Бога” (па іхняму меркаванню), чамусьці не кажуць. Магчыма, жывуць па прынцыпе аднаго з сваіх гістарычных папярэднікаў – пасля нас хоць патоп.



Таксама ўжо зразумела, што ў 2012 годзе план па росту ВУП у памеры 5,5% не быў выкананы, у лепшым выпадку атрымаем рост каля 2 %. На 2013 год нашы чараўнікі з урада запланавалі рост ВУП аж на цэлых 8,5 %, толькі абсалютна незразумела, за кошт чаго яны гэты шалёны рост будуць забяспечваць.

Таму, паважаныя чытачы, перспектывы ў гэтым годзе ў нас не вельмі добрыя, нездарма ж нават улады аб’явілі яго годам эканоміі і беражлівасці. І, калі вам пачынаюць вешаць локшыну пра далейшы рост заробкаў і дабрабыту ў Бялыніцкім раёне бліжэйшым часам, крыху задумвайцеся, ці можна верыць у гэтыя казкі. Калі дабрабыт і вырасце, то толькі ў саміх нашых “мудрых” чыноўнікаў, простыя ж бялынічане па-ранейшаму будуць забяспечваць годны ўзровень жыцця ва ўласных сем’ях за кошт працы на чужыне ў Расіі на “брацкіх” капіталістаў…

Барыс Вырвіч


ПОЧЕМУ БЫ НЕ СРАЗУ В ФАРАОНЫ?

Не надо иметь семь пядей во лбу, чтобы догадаться о том, что последует за запретом на увольнение. Если эта придумка, противоречащая закону, логике и здравому смыслу станет реальностью, придется принимать сопутствующие меры: отбирать у крестьян паспорта, вводить оплату трудоднями, помещать инакомыслящих в лагеря и использовать их бесплатную рабсилу на стройках «народного» хозяйства, вводить продразверстку и практиковать голодоморы, как средство усмирения особо борзых.

Фразу «устал уговаривать» произносили и до Лукашенко. Руководители тоталитарного толка, строившие свою власть на вмешательстве государства во все сферы жизни: от управления экономикой, до создания произведений искусства, рано или поздно уставали уговаривать свой неразумный народ и объявляли что-нибудь похожее на военный коммунизм.

Чтобы ни пытался придумать белорусский диктатор все это будет плагиатом.

Так у декрета, который Александр Григорьевич поручил подготовить, есть аналоги. Почти сто лет назад, декретами, принятыми Советом Народных Комиссаров 12 апреля 1919 года и 27 апреля 1920 года, запрещались самовольный переход на новую работу и прогулы, устанавливалась суровая трудовая дисциплина на предприятиях. Узаконивалась система неоплачиваемого добровольно-принудительного труда в выходные и праздники в виде «субботников-воскресников».



Белорусский президент ограничен в своих фантазиях. Способы воплотить в жизнь его небесно-цветочные мечты о прибыльности колхозного сельского хозяйства, о торжестве плановой экономики над частным бизнесом и трепетной любви народа к непогрешимому правительству, можно пересчитать по пальцам одной руки.

Даже плодотворную идею симбиоза марксизма и национальных традиций успел запатентовать Ким Ир Сен.

Вот выходит, что стать новатором у Лукашенко никак не получится. Так может и не стоит заморачиваться? Родовая аристократия, созданная из семей чиновников у нас уже есть. Верховный главнокомандующий, верховный законодатель и судья в одном лице тоже имеется. Ледовые дворцы почти ничем не отличаются от пирамид.

К чему тогда все полумеры? Президенту, по примеру фараонов, достаточно объявить себя сыном богов или даже богом, чтобы раз и навсегда расставить все точки над «і».

Сергей Антонов

БЯЛЫНІЦКІЯ АКТЫВІСТЫ ПАВІНШАВАЛІ ПАЛІТВЯЗНЯЎ СА СВЯТАМІ



Бялыніцкія дэмакратычныя актывісты напрыканцы снежня адаслалі па пошце віншавальныя паштоўкі з надыходзячымі святамі Божага Нараджэння і Новага года, а таксама і лісты са словамі падрымкі ўсім беларускім палітвязням.

“Мы адаслалі гэтыя паштоўкі і лісты, каб хоць нейкім чынам выказаць палітвязням сваю падтрымку і салідарнасць, - кажа бялыніцкі журналіст Барыс Вырвіч. – У гэтыя перадсвяточныя дні кожны чалавек спадзяецца на лепшае і марыць пра тое, каб яго спадзяванні і надзеі ажыццявіліся ў бліжэйшы час. Таму вельмі важна выказаць нашу падтрымку людзям, якія зараз знаходзяцца ў вельмі складаных умовах, падвяргаюцца ціску з боку адміністрацыі ў зняволенні. Няхай ведаюць, што на волі пра іх памятаюць і падтрымліваюць”.

Па словах Барыса Вырвіча, бялыніцкія грамадскія актывісты стараюцца падтрымліваць пастаянныя кантакты з беларускімі палітвязнямі, рэгулярна дасылаючы ім лісты і паштоўкі салідарнасці.

Сяргей Семяновіч

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

МОГИЛЕВЧАН ЗАСТАВЛЯЮТ ВЫПИСЫВАТЬ ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ГАЗЕТЫ

Жителей Беларуси принудительно подписывают на государственные СМИ. За выполнение плана роста тиража газет, как выяснил корреспондент DW, отвечают идеологические отделы предприятий.

Ежегодно в конце декабря в Беларуси заканчивается подписка на периодические издания на следующий год. Но граждане тянут с ней до последнего, ожидая, пока кампания закончится на государственных предприятиях. Они опасаются, что будут вынуждены по месту работы еще раз подписаться на то же издание, которое уже абонировали самостоятельно.

Подписка - это не страшно

"Подписка - это совсем не страшно", - так описывает принудительную агитацию за идеологически правильные газеты и журналы могилевчанка Елена. По ее словам, это выглядит следующим образом. В бухгалтерию, где работает Елена и еще семь человек, заходит замдиректора по идеологической работе и с сочувствием в голосе ставит всех перед фактом: отдел обязан выписать пять газет. Это приказ. Далее сотрудники уже сами решают, кто какое издание выбирает.

Проблема в том, что три из пяти обязательных экземпляров - это "Советская Белоруссия" (СБ, один из ее учредителей - президентская администрация), а остальные два - местные газеты. Работники предприятия хотят, как правило, читать именно местную прессу, так как в ней печатают программу телевидения и региональные новости, в отличие от центральных изданий, перегруженных идеологически выверенными материалами.

Право выписать могилевские газеты предоставляют в первую очередь тем, чьи члены семьи уже были вынуждены подписаться на "СБ" на своих предприятиях. Если же не повезло всему отделу, кому-то придется выписать вторую "Советскую Белоруссию" на семью. Такие случаи уже были.

Каких-либо санкций за отказ от подписки не предусмотрено. Но бухгалтеры -коллеги Елены опасаются, что если в будущем им понадобится отлучиться с работы или попросить о какой-либо помощи, то рассчитывать на лояльность руководства не придется. Впрочем, по признанию женщин, зла на штатных идеологов они не держат, понимая, что планы подписки спущены сверху и начальство само зависит от вышестоящих инстанций.

Требования ужесточились

Несколько иначе обстоит дело в сельской местности, где уровень зарплат гораздо ниже, чем в городе, и жители считают каждую копейку. Проживающий в Белыничском районе редактор малотиражной независимой газеты Борис Вырвич утверждает, что в нынешнем году практика принудительной подписки стала особенно агрессивной. Если раньше идеологи обязывали выписывать "Советскую Белоруссию" только работников бюджетных предприятий, то теперь читать "правильную" прессу они заставляют рабочих и колхозников.

Сам Вырвич выступает в районе в роли своеобразного громоотвода. Селяне боятся открыто критиковать власть, поэтому "ретранслируют" свое недовольство через редактора малотиражки. В его присутствии работник белыничского "Жилкомхоза" посетовал на то, что впервые на предприятии приказали в обязательном порядке подписаться на государственную газету. Идеологи сослались при этом на некий негласный приказ, обязательный для исполнения.

Люди вынуждены выписывать газеты из-за боязни потерять работу, говорит работник "Жилкомхоза". Он не скрывает, что некоторые его коллеги уже давно ничего не читают, имеют проблемы с алкоголем и соответственно получают взыскания. Ме-



стные идеологи этим пользуются и составляют планы подписки, в которых указывают, кто и какие издания должен абонировать. Планы с перечнем и количеством госизданий доведены до сведения почтальонов белыничского районного узла связи, которых и обязали обеспечивать подписку на предприятиях района.

Технологии идеологической работы

По мнению Бориса Вырвича, это не перегибы на местах, а продуманная тактика властей. В пользу его версии говорит и то, что конец подписной кампании совпал по времени с семинаром идеологических работников Могилевской области на тему "Реализация потенциала человека - условие развития белорусского общества: опыт и задачи идеологической работы, особенности деятельности СМИ". В течение двух дней начальники отделов идеологической работы и представители СМИ обсуждали "условия и технологии идеологической работы".

"Коррекция и даже моделирование общественного сознания становятся обязательным атрибутом современного государства", - разъяснил участникам семинара начальник управления идеологической работы Могилевского облисполкома Андрей Кунцевич. Действенным методом взаимодействия идеологов с населением, по

(Начало. Оконч. на стр. 5)

РЭЙТЫНГ ЛУКАШЭНКІ «ЗАМАРОЗІЎСЯ» — 31,5 ПРАЦЭНТАЎ

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД) апублікаваў вынікі чарговага нацыянальнага апытаньня, праведзенага ў сьнежні.

Паводле гэтага апытаньня, сёньня за Аляксандра Лукашэнку прагаласавала б 31,5 працэнты, што фактычна не зьмянілася ў параўнаньні з апошнім апытаньнем у верасьні-кастрычніку (тады было 31,6).

У сьнежні 39 працэнтаў заявілі, што давяраюць прэзыдэнту, 49 — не давяраюць. Як адзначаюць дасьледчыкі НІСЭПД, працягваецца геапалітычны дрэйф беларусаў у бок Захаду. На пытаньне аб выбары паміж аб'яднаньнем з Расеяй і ўступленьнем у Эўразьвяз погляды рэспандэнтаў разьмеркаваліся такім чынам — 37,7 — «за Расею», 43, 4 — «за Эўразьвяз»

Разам з тым, працягваецца стабілізацыя «эканамічнага адчуваньня» беларусаў. Колькасьць тых, хто заяўляе, што іхняе матэрыяльнае становішча пагоршылася, у параўнаньні з верасьнем фактычна не зьмянілася — 26, 7 у сьнежні супраць 25 працэнтаў у верасьні.



Разам з тым, колькасьць тых, хто лічыць, што «становішча справаў у краіне разьвіваецца ў няправільным накірунку», па-ранейшаму перавышае колькасьць тых, хто з гэтым тэзісам нязгодны — 47,4 супраць 34,1

Галоўным віноўнікам цяперашняга крызісу беларусы называюць прэзыдэнта (41 працэнт) і ўрад (39,1)

НІСЭПД — незалежны навуковы цэнтар, які праводзіць дасьледаваньні грамадства ад 1992 году. У 2005 годзе, пасьля ліквідацыі Вярхоўным судом Беларусі, быў вымушаны зарэгістравацца ў Літве.

Радыё Свабода

МОГИЛЕВЧАН ЗАСТАВЛЯЮТ ВЫПИСЫВАТЬ ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ГАЗЕТЫ

(Оконч. Начало на стр. 4)

его мнению, является общение посредством СМИ.

А заместитель председателя облисполкома Валерий Малашко призвал в первую очередь использовать региональные ресурсы. “Районная пресса дает хорошую возможность разъяснить людям политическую и экономическую ситуации, дать финансовый анализ, научить необходимой терминологии и получить обратную связь”, - считает Малашко.

“Жить не по лжи”

По мнению могилевского координатора правозащитного центра “Весна” Алексея Колчина, ситуация с принудительной подпиской на государственную прессу в ближайшее время вряд ли изменится. Проблема в том, говорит Колчин, что своим отказом от предложенной идеологами подписки человек автоматически переводит себя в разряд “неблагонадежных”.

Очевидно, что руководство предприятия начнет давить на непослушного работника, а рычагов такого давления в сегодняшней Беларуси множество. И, кроме знаменитого призыва Александра Солженицына “жить не по лжи”, предложить в данной ситуации нечего, констатирует Колчин. Однако такой выбор, по его выражению, потребует от человека определенного мужества - не участвовать в умножении зла и лжи.

Александр Бураков, DW

РЫГОР КАСТУСЁЎ: СТАНОЎЧЫЯ ЗМЕНЫ НАЎРАД ЦІ АДБУДУЦЦА

Наш зямляк, намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў не чакае карэнных зменаў у Беларусі. Пакуль не зменіцца ўлада чакаць зменаў у лепшы бок не прыходзіцца, лічыць палітык.

– Пакуль будзе ў Беларусі існаваць рэжым, станоўчыя перамены наўрад ці адбудуцца. Бо адбываецца далейшая прывязка Беларусі да Расіі. Крэмль імкнецца яшчэ больш усталявацца ў Беларусі праз між іншым умяшальніцтва ў палітычныя падзеі. Таму нам трэба прыкладаць намаганні, каб як мага лепш адбівацца ад Крамля і імкнуцца да таго, каб у Беларусі адбываліся і эканамічныя змены, і змены ў палітычным плане, імкнуцца да таго, што сказана ў мемарандуме, які падпісаны ў Вільне.

Мемарандум «Аб захадах па забеспячэнні незалежнасці Беларусі» быў прыняты 3 лістапада ў часе нарады беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацый са старшынёй Рады БНР Івонкай Сурвілай.

Сутнасць мемарандуму заключаецца ў каардынацыі дзейнасці ўсіх палітычных і грамадскіх структур беларускай апазіцыі ўнутры краіны і за мяжой. Гэта робіцца з мэтай вызваліць палітвязняў і рэабілітаваць іх, спыніць палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі, захаваць свабоду СМІ і правесці свабодныя выбары.

Валянціна Лаеўская, Беларускае Радыё Рацыя

ПЬЮТ И БЬЮТ

26 декабря Белыничским районным отделом СК возбуждено у/д по ст. 147 ч. 1 УК (Умышленное причинение тяжкого телесного повреждения) в отношении неработающего жителя д. Прихабы Белыничского района (ранее судимого по ст.ст. 205 ч. 1, 317-1 ч. 2 УК) 1990 г.р., который 25 декабря около 15-00 по месту жительства, в ссоре после совместного распития спиртных напитков, избил односельчанина 1959 г.р., причинив ему телесные повреждения. Задержан в порядке ст. 108 УПК, сообщает uvd.mogilev.by.

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ЛЕВ МАРГОЛИН: ЛУКАШЕНКО ГОТОВИТСЯ “К ГРАНДИОЗНОЙ ПРИВАТИЗАЦИИ”

Под занавес уходящего года сменились руководители сразу нескольких белорусских предприятий. Президент Александр Лукашенко 28 декабря дал согласие на назначение генеральным директором МАЗа Виктора Основского, генеральным директором МТЗ – Владимира Волчка. Кроме того, Александр Камко назначен генеральным директором ПО “Гомсельмаш”, а Сергей Гунько – генеральным директором ПО “Витязь”. Михаил Сучков стал председателем концерна “Беллегпром”.

Что означает массовая замена руководителей белорусской промышленности? По мнению зампредседателя ОГП экономиста Льва Марголина, новые назначения сделаны “в преддверии грандиозной приватизация, которая, по-видимому, начнется в 2013 году”.

– До конца года не решены многие вопросы, которые должны были. Не решен вопрос по 4,5 млн тонн нефти (Россия предлагает поставить 18,5 млн тонн нефти в 2013 году, в то время как Беларусь рассчитывает на 23 тонны – udf.by), не решен вопрос по возмещению убытков, нанесенных бюджету РФ за счет экспорта растворителей-разбавителей, – отметил Марголин. – Все эти вопросы переходят на следующий год и, судя по всему, рассчитываться за их положительное решение придется госсобственностью.

По мнению экономиста, люди, занявшие накануне нового года кресла руководителей МАЗа и МТЗ, которые будут ответственны за подготовку предприятий к проведению приватизации.

Экономист Леонид Злотников не считает такую ротацию подготовкой к масштабной приватизации. По его мнению, действующие руководители “всегда выполняют команду сверху”.

– Если бы коренным образом менялась экономическая политика, тогда нужны были бы новые люди. Но пока ведь политика не меняется, – сказал Злотников.

Лев Марголин других объяснений кадровым перестановкам не видит, поскольку “особых провалов в работе ни МАЗа, ни МТЗ нет. Они достаточно устойчивы по нашим возможностям работы”.

Он напомнил, что Беларуси предстоят значительные валютные расходы, а поступлений при этом не ожидается.



– Даже транш кредита ЕврАзЭС, по которому положительное решение уже принято, так и не поступил. А, как известно, одним из условий предоставления этого кредита, была приватизация на $2,5 млрд ежегодно. Это план мы успешно в этом году завалили, – напомнил Марголин. – Думаю, Россия не будет больше терпеть этого и просто так выделять деньги. Белорусское руководство будут заставлять приступить к масштабной приватизации. Других вариантов у нашей экономики нет.

Что же касается назначения нового руководителя концерна “Беллегпром”, то его экономист назвал “текущим”.

– Не так давно Лукашенко устроил там полный разгон по отрасли легкой промышленности. Правда, делается это не первый раз. За время президентства Лукашенко это уже, наверное, третий или четвертый руководитель концерна. Но работать легкая промышленность от этого лучше не начинает, поскольку предприятия не реформированы. Структура остается такой же, как в давние советские времена. И до тех пор, пока эти предприятия не будут приватизированы и не будут реформироваться, результатов работы легкой промышленности мы не увидим, – заявил Марголин.

Мария Ковалева, UDF.BY

ТОЛЬКО ФАКТЫ

На учете в управлении по труду, занятости и социальной защите Белыничского райисполкома состоит 7229 получателей пенсий и пособий, в т.ч. 61 ветеран Великой Отечественной войны, 224 многодетных семьи, 796 неполных семей, 55 семей, воспитывающих детей-инвалидов.

Средняя заработная плата по народному хозяйству Белыничского района в октябре сложилась на уровне Br3587,4 тыс. По сравнению с аналогичными периодами 2011 года темп роста номинальной заработной платы составил 189,0%.

ДЛЯ КОГО ДЕНЕГ НЕ ЖАЛКО?

Рост бюджетных расходов на ту или иную сферу — показатель, свидетельствующий о том, какие сферы для государства являются приоритетными. Анализ процентных расходов государственного бюджета Беларуси позволяет понять, что на самом деле стоит за пропагандистским лозунгом о социальной ориентированности казны.

Так, расходы на пенсионное обеспечение уменьшились с 5,42% в 2006 году и 5,44% в 2011-м до 3,82% в 2013 году. Это будет практически самый низкий показатель за последние семь лет. Ниже был только в 2010 году, кода на эти цели было потрачено 3,65% государственного бюджета.

В целом по разделу “Социальная политика” финансирование сократилось с 9,33% в 2006 году до 6,83% в 2013-м.

Резко сокращены расходы на охрану окружающей среды — с 2,31% в 2006-м до 0,56% в 2013-м. Меньше денег на эти цели белорусское государство никогда не выделяло.

Серьезные потери понес и раздел “Национальная экономика”. В 2006 году 31,12% бюджета выделялось именно на эту сферу. В бюджете 2013-го года заложено только 14,48%. Это тоже рекордный минимум. Причем, денег не досчитаются даже традиционные любимцы госказны. Так, на проекты в сельском хозяйстве отводится 5,55% бюджета (в 2006-м году это было 12,81%). Рушится и миф о хороших белорусских дорогах: дорожное хозяйство в 2006-м получало 9,05% всех средств, в 2013-м это будут только 1,97%.

Расходы на образование, физкультуру, культуру на протяжении последних лет значительно не менялись. Расходы на здравоохранение даже имеют некоторую динамику роста (с 3,97% в 2006-м до 4,39% в 2013-м). Однако при этом непосредственно на оказание медицинской помощи гражданам денег выделяется меньше: в 2006-м это было 2,58%, в 2013-м - 2,14%.

Но если где-то убыло, то, как известно, где-то должно прибыть. Финансирование каких сфер увеличено?

Резко выросло финансирование общегосударственных расходов: с 32,84% в 2006 году до 52,65% в 2013-м. Самый резкий рост — по позициям



“Обслуживание государственного долга” и “Трансферты другим уровням государственного управления” (именно поэтому главы районной “вертикали” могут позволить себе дорогие авто, чтобы гордо разъезжать по своим нищим регионам). Однако несмотря на то, что 2013-й объявлен Годом бережливости, и госорганы общего назначения себя не обидели. В 2010-м на их финансирование шло 2,05% госбюджета, в 2008-м — 2,28%, в 2009-м — 2,21%. В 2013-м году это уже будет почти 3% госбюджета.

Правоохранительная деятельность и обеспечение безопасности “съест” 8,59% госказны. Это больше, чем финансирование всех проектов в области социальной политики, или образования, или здравоохранения. Стоит отметить, что расходы на полицейщину растут стремительными темпами: еще в 2009-2010 гг. они составляли 6,47-6,48%. То есть за пару лет выросли сразу на 2%, чем не может похвастать ни одна другая сфера.

При этом совершенно очевидно, что власть концентрирует силы и финансовые средства на борьбе именно с внутренним врагом, поскольку расходы на национальную оборону все последние годы резко не менялись. В 2013 году они составят 5,03% госбюджета. В нынешем году это было 4,96%, годом ранее — 5,3%, и за эти показатели финансирование белорусской армии в последние годы не выходило.

Материал подготовлен по данным сайта “Открытые данные”

ЗАІКА ПРА КРЭДЫТЫ ЛУКАШЭНКІ: «ХТО АДДАВАЦЬ БУДЗЕ?»

Кіраўнік аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леанід Заіка пракамэнтаваў «Радыё Свабода» выказваньні Аляскандра Лукашэнкі пра эканамічную сытуацыю ў краіне.

Кіраўнік дзяржавы зрабіў іх падчас наведваньня Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Пра тое, што Беларусь атрымае ў 2013 годзе 23 мільёны тон расейскай нафты

«Дрэнныя справы ў краіне, калі вымушаныя прасіць нафту і жыць за кошт нафтавага наркотыку. Расея стараецца адыйсьці ад экспартнай нафтавай залежнасьці, а мы просім яшчэ болей. Для беларускай эканомікі хапае 7 мільёнаў тон. А астатняе рабіце рукамі і мазгамі. Значыць, нешта будзем аддаваць».

Пра тое, што кітайцы даюць крэдыт на мільярд даляраў

«Кітайцы — гэта габрэі Ўсходу. Значыць, яны даюць грошы пад перасяленьне 650 тысяч кітайцаў у ваколіцы Менску. І як бы там нашы кіраўнікі не казалі, што гэтага ня будзе, паглядзім».

Пра тое, што просяць у Расеі 2 мільярды танных грошай

«Узьнікае пытаньне. Набралі ўжо пазыкі 32 мільярды. Яшчэ два набярэм. Хто аддаваць будзе? Прозьвішча і імя — хто будзе аддаваць?».

Анекдот дня

Два года колонии получил сантехник ЖЭСа Семен за выкрики на улице: «Всё прогнило, всю систему нужно менять».

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ШКЛОЎСКІЯ “РАЗБОРКІ”



Інфармацыю, што ў кабінетах кіраўніцтва РВУП “Завод газетнай паперы” ў Шклоўскім раёне 18 снежня прайшлі агляды і канфіскацыя дакументаў супрацоўнікамі ўпраўлення па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў УУС Магілёўскага аблвыканкама, паведаміла інфармацыйнае агенства БелаПАН.

Пра тое, што супрацоўнікі праваахоўных органаў наведалі РВУП “Завод газетнай паперы” і правялі там вынятку дакументаў, журналістам “Паходні” таксама стала вядома 18 снежня ад работнікаў гэтага завода. Нагадаем, што завод газетнай паперы ў Шклове быў урачыста ўведзены ў эксплуатацыю ў траўні 2008 года асабіста кіраўніком краіны Аляксандрам Лукашэнка.

Жыхары Шклова і работнікі РВУП “Завод газетнай паперы” называюць дзве прычыны, якія маглі паслужыць нагодай для правядзення аглядаў і выняткі дакументаў на заводзе ў Шклове.

Па адной з версій, пачутых ад жыхароў Шклова, падставай для вобшука паслужыла тое, што пры ўводзе ў эксплуатацыю РВУП “Завод газетнай паперы” замест новага абсталявання, па незразумелых прычынах, было закуплена старое, выробленае яшчэ ў Савецкім Саюзе. З-за гэтага прадпрыемства пастаянна ліхаманіць, яно перыядычна спыняецца на рэканструкцыю, не атрымліваецца наладзіць выпуск газетнай паперы прыстойнай якасці.

“Пасля таго, як на прадпрыемстве было ўсталявана закупленае ў Расіі новае абсталяванне, цікаўныя рабочыя РУП “Завод газетнай паперы” змаглі падкавырнуць біркі і разгледзець, што выпушчана яно яшчэ ў 70-х гадах мінулага стагоддзя ў Савецкім Саюзе, - распавядае адзін з жыхароў Шклова. – Знаёмыя працаўнікі прадпрыемства кажуць, што гэта абсталяванне выраблялась для працы ў трапічных краінах, таму ў Беларусі на ім магчыма перапрацоўваць толькі елку. Чаму пры дзесятках кантралюючых інстанцый было закуплена састарэлае абсталяванне, для мяне асабіста вялікая загадка. Прадпрыемства доўгі час не маглі запусціць у эксплуатацыю, пасля РВУП “Завод газетнай паперы” неаднаразова спынялась на рэканструкцыю, для наладкі працы абсталявання запрашаліcь замежныя спецыялісты з розных краін. Магчыма, супрацоўнікі праваахоўных органаў зараз здолеюць высветліць усе нюансы гэтай цёмнай справы”.

Іншую версію прычын з’яўлення супрацоўнікаў АБЭЗ на РВУП “Завод газетнай паперы” у Шклове выказаў другі мясцовы жыхар, які мае пастаянныя кантакты з супрацоўнікамі завода.

“Згодна атрыманай мной інфармацыі, супрацоўнікі міліцыі зацікавіліcь працай філіяла “Домабудаванне” РВУП “Завод газетнай паперы”. І гэта адбылось не выпадкова менавіта пасля візіта ў Шклоў 15 снежня кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі. Як вядома, ён апошнім часам узяўся за дрэваапрацоўку. РВУП “Завод газетнай паперы” атрымаў вялікія сродкі на мадэрнізацыю вытворчасці і забеспячэнне выпуску новых відаў прадукцыі, закупу новага абсталявання. І з’явілася інфармацыя, што гэтыя сродкі выкарыстоўваліcь не па прызначэнню”.

Між тым дырэктар РВУП “Завод газетнай паперы” Анатолій Хмялеўскі ў каментары інфармацыйнаму агенцтву БелаПАН сцвярджае, што ніякага агляду супрацоўнікі міліцыі не праводзілі, яны быццам бы папрасілі толькі паказаць нейкія дакументы па нязначнай справе, што іх зацікавіла.

Нагадаем, што Шклоўскі завод газетнай паперы завод пачалі будаваць яшчэ ў 2005 годзе па ініцыятыве Аляксандра Лукашэнкі. Напачатку будаўніцтва прадпрыемства Аляксандр Рыгоравіч паставіў перад чыноўнікамі, адказнымі за ўвядзенне ў эксплуатацыю «Завода газетнай паперы», задачу: ужо ў 2008 годзе прадпрыемства павінна на 100 працэнтаў забяспечыць беларускія СМІ газетнай паперай.

На жаль, зрабіць гэта чамусьці не атрымалася.

“Паходня” будзе сачыць за развіццём падзей ў суседнім раёне і інфармаваць аб гэтым сваіх чытачоў.

Віктар Баравікоў

“Бялыніцкія музыкі” - лепшыя

25 снежня ў эфіры тэлеканала АНТ адбыўся фінал другога тэлевізійнага конкурсу «Песні маёй краіны». Пераможцам стаў народны ансамбль фальклорнай музыкі “Бялыніцкія музыкі” з Магілёўскай вобласці пад кіраўніцтвам Вольгі Маісеенкі. За кампазіцыю “Дудалка” прагаласавалі амаль 20 тыс. чалавек.

З невялікім адставаннем ад нашых прадстаўнікоў (атрымалі 19 681) на другім месцы апынуліся «Пескаўскія веселухі» (Бяроза), на трэцім (13 121) - «Медуніца» (Ваўкавыск).

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Адрас рэдакцыі: Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 03.01. 2013 г. у 09-00.